Фестываль

# ШТО БАЛІЦЬ

## Пра тое гавораць сучасныя рэжысёры


«Плошча герояў».

**Сканцэнтравацца на думках прапануе сёлета ТЭАРТ. 15 спектакляў, што склалі беларускую і міжнародную праграму, паводле арганізатараў уяўляюць з сябе ў пэўнай ступені канцэнтрат ідэй, разваг і эмоцый.**

— Кожны спектакль сканцэнтраваны на нечым сваім, важным, — адзначае дырэктар Міжнароднага форуму тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ» Анжаліка Крашэўская. Сапраўды, сучасны тэатр вельмі розны, але ён не страціў сваёй функцыі размаўляць з людзьмі пра нешта вельмі важнае, сур'ёзнае, балючае, тое, што хочацца абмеркаваць ці вырашаць на ўзроўні грамадства. — А мы хочам гаварыць пра тое, што нам баліць.

Таму ў асобны кірунак у рамках фестывалю сёлета вылучана праграма «Тэатр сацыяльных даследаванняў», якая дапаўняе шоўкейс Belarus Open. Наогул падбор спектакляў беларускай праграмы — гэта таксама даследаванне: грамадства шляхам тэатральных практык. Таму што ў тэатр мы ходзім не толькі дзеля адпачынку ці задавальнення, але і для таго, каб атрымаць штуршок для роздумаў, асэнсаванняў таго, як жывём і што можам удасканаліць у сабе ды навокал. І нават сам тэатр можа ўдасканальвацца, дзеля гэтага ўласна фестываль і задумваўся.

— Тэатр — гэта жывое мастацтва, ён можа мяняцца, — лічыць **Людміла ГРАМЫКА, куратар праграмы Belarus Open.** — За час існавання форуму ТЭАРТ і шоўкейса, які складаюць айчынныя пастаноўкі, беларускі тэатр змяніўся.

Варта прыглядзецца. Стартуе фестываль з 20 верасня менавіта з беларускай праграмы, куды ўвайшлі самыя адметныя спектаклі, якія выклікалі рэзананс за апошні час, дзе ёсць пошук і ідэя, актуальнасць. Дзе вядзецца размова пра нас, пра Беларусь. Гэта важна яшчэ і таму, што на фестываль запрашаюцца крытыкі з іншых краін, яны імкнуцца зразумець, што хвалюе людзей, якія жывуць у гэтай краіне, і якія працэсы адбываюцца ў нашым тэатры. Для гэтага адабралі восем пастановак: «Палянванне на сябе» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі (рэжысёр Стас Жыркоў), пастаноўку Юрыя Дзівакова «Песня песняў» Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў ART Corporation, «Кандзід, альбо аптымізм» Магілёўскага абласнога тэатра лялек у пастаноўцы Ігара Казакова, танец-спектакль «Паветра» Вольгі Лабоўкінай і тэатра Karakuli, спектакль Мікалая Халезіна і Наталлі Каляды «Дом № 5», «Павятовы лекар» Гомельскага гарадскога маладзёжнага тэатра (рэжысёр Юрый Дзівакоў), спектакль Аляксандра Янушкевіча «Вартаўнікі Тадж-Махала» (Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў ART Corporation), «ГЭТАМЫ» Незалежнага тэатральнага праекта (рэжысёр Стас Жыркоў).

Тэатр як сацыяльнае даследаванне і сродак уплыву на грамадства — кірунак не новы для тых, хто сочыць за тэатральным рухам. Але ўпершыню ён вылучаны ў асобную частку на міжнародным форуме. Рыхтуемся да знаёмства з Лабараторыяй сацыяльнага тэатра ECLAB Валянціны Мароз, якая пакажа спектакль «Родныя людзі?» на тэму хатняга гвалту. Беларуска-брытанскі праект HUNCHtheatre Уладзіміра Шчэрбаня ўдзельнічае з пастаноўкай «Левыя дысідэнты», створанай паводле сучасных айчынных аўтараў Алены Шпак і Андрэя Дзічэнкі. Брэсцкі тэатр «Крылы халопа» і Аксана Гайко прэзентуюць праект Brest Stories Guide, які прапануе размову на тэму антысемітызму, звяртаючыся да гістарычных падзей знішчэння Брэсцкага гета.


«Кандзід, альбо аптымізм».

Тэатр як адлюстраванне чалавечай гісторыі хоча быць актуальным. Беларускі тэатр хоча вучыцца і асвойваць новыя плыні, падыходы і спосабы абудзіць нашу неабыякавасць да самога жыцця. І ёсць рэжысёры, для якіх гэта галоўная мэта творчасці. Менавіта на асобу рэжысёра звяртае ўвагу «Школа ТЭАРТ».

— Наша мэта рэалізуецца па двух кірунках: найперш трэба паглядзець, якія функцыі ў наш час выконвае рэжысёр, — тлумачыць **куратар гэтай часткі Аляксандр МАРЧАНКА.** — А далей трэба высветліць, якія магчымасці ёсць для пашырэння такіх функцый.

Вучыцца варта ў асоб. Напрыклад, такіх як Вацлаў Гавел, які вельмі паўплываў як аўтар і як чалавек з моцнай пасіянарнай энергіяй на абуджэнне народаў Усходняй Еўропы. У межах Школы адбудзецца паказ спектакля «Дуплет» і сустрэча з яго стваральнікам грузінскім рэжысёрам Канстанцінам Абашыдзэ. Яшчэ адна асоба — швейцарскі рэжысёр Дэні Майфер, адзін з кіраўнікоў тэатра La Comedie de Geneve. Пад яго кіраўніцтвам пройдзе рэжысёрская лабараторыя, падчас якой удзельнікі будуць думаць над стварэннем спектакля паводле Шэкспіра.

Свае асобы ў тэатры?.. Ёсць, і таксама гатовыя падзяліцца прафесійным досведам, але падчас дыскусіі. Цікавыя думкі Дзмітрыя Багаслаўскага, Ігара Казакова, Аляксандра Янушкевіча? Вядомыя па рабоце ў айчынных рэпертуарных тэатрах, яны паспрабавалі сябе як вольныя мастакі і могуць казаць пра тое, як заставацца ў тэатральным працэсе ды рэалізаваць сябе ў мастацтве.

І пра мастацтва, яго сусветныя ўзоры. З імі звычайна знаёміць міжнародная праграма, усяго чатыры спектаклі. Гамераўская «Адысея» — вечная класіка, якую цікава глядзець у незвычайных інтэрпрэтацыях. Тэатр Талія з Германіі ў межах 25-гадовага Інстытута Гётэ ў Беларусі прадставіць адметны варыянт прачытання Гамера ад рэжысёра Анту Рамера Нуньеса. Класічны тэкст будзе прамаўляцца на мове, якой не існуе наогул. Вось і магчымасць пераканацца ў тым, што тэатральны твор, нават калі не ведаеш мовы артыстаў, усё адно кранае гледача. Тое ж самае павінна здарыцца падчас яшчэ аднаго прагляду — французская харэаграфічная спектакля «Піксель». Харэограф Мурада Мерзукі скіраваны на дыялог. Гэта дыялог не толькі паміж культурамі і народамі, гэта яшчэ дыялог паміж мастацтвам танца і візуальнымі 3D-выявамі.

У дыялог паміж эпохамі прапаноўвае ўключыцца Літоўскі нацыянальны драматычны тэатр у спектаклі «Плошча герояў», створаным паводле Томаса Бернхарда польскім рэжысёрам Крысціянам Люпам. Ці быў пераможаны фашызм падчас Нюрнбергскага працэсу? І ці не можа гэта пагражаць нашым узроўні і пад іншай маскай?..

У нечым сугучнай можа падасца пастаноўка «Сталінград» рэжысёра Рэзо Габрыадзэ. Яго ўласныя ўспаміны з далёкага мінулага ажываюць праз работу акцёраў з марыянеткамі. Тэатр, які скарае свет, — тэатр шчыры.

Канцэнтрат шчырасці — вось чаго варта чакаць сёлета падчас ТЭАРТу.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**



Выстаўка

# Адкрыты космас

## «Вайна сусветаў» Аляксандра Кішчанкі дэманструецца шырокай публіцы

Мастак Аляксандр Кішчанка мысліў маштабна. Рассоўваў гарызонты, выходзіў за рамкі. Нават за магчымасці, якія былі вызначаны для пэўных твораў мастацтва. Таму і быў сапраўдны манументаліст — калі рабіў, дык без абмежаванняў. Гэта дало штуршок арганізатарам выстаўкі, што праце ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, па-новаму асэнсаваць творчасць народнага мастака, які пакінуў свет напрыканцы XX стагоддзя.

Але ж гэтае самае стагоддзе яго натхняла і давала падставы для разваг, прычым на ўзроўні грамадства. Чаго варты толькі яго «Габелен стагоддзя», які вельмі актыўна абмяркоўваўся, і не толькі ў творчым асяроддзі. Таму што адлюстраваныя на ім людзі, пра якіх найбольш гаварылі ў XX стагоддзі (і неабавязкова станоўча — пра Сталіна, напрыклад), падзеі, калі закладвалася чалавечая гісторыя, — ад Ноева каўчэга і далей, да Ісуса Хрыста і прыходу магчымага Антыхрыста. Таму, што вобразы, створаныя мастакамі, часам сапраўды з`яўляюцца ў жыцці, іх прадчуванні спраўджваюцца, а творы бываюць прарочымі, хочацца думаць, што Кішчанка сумяшчаў несумяшчальнае (як падавалася) не проста так. Магчыма, ён бачыў увогуле — не толькі зямное. Таму назва «Касмічны пілігрым» пасуе выстаўцы народнага мастака Беларусі Аляксандра Кішчанкі.

Сваё касмічнае мысленне ён рэалізаваў у Беларусі. Нарадзіўся ў Расіі, вучыўся ва Украіне, але асноўную частку творчага жыцця і галоўныя творчыя этапы ён пражыў у Беларусі. Спрыяў развіццю беларускага мастацтва — манументальнага, габеленавага. Але тут і цяпер мы гаворым пра жывапіс.

Творы розных тэм і жанраў апошніх дваццаці гадоў жыцця майстра сышліся ў экспазіцыі, хоць і знаходзяцца цяпер у розных зборах: у Нацыянальным мастацкім музеі, сям'і мастака, у прыватных калекцыях. Партрэты, нацюрморты, кампазіцыі, у якіх закранаецца сацыяльная праблематыка, распавядаюць пра суіснаванне ідэальнага Чалавека і Сусвету.

«У экспазіцыю ўключаны як вядомыя хрэстаматыйныя палотны майстра, так і творы, што ніколі раней не дэманстраваліся шырокай публіцы. Сярод такіх, напрыклад, карціна «Вайна сусветаў» — апошняя работа майстра, — адзначае **куратар праекта Наталля СЯЛІЦКАЯ, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснага беларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея.** — У канцы 1970-х гадоў канчаткова сфарміравалася яго ўласная пластычная сістэма «касмічнай» пабудовы прасторы, якую ён сам назваў «усяленскім рэалізмам», заснаваным на ўзаемадзеянні двух пачаткаў: сімволікі, уласцівай прыёмам манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, і рэалістычнай пераканаўчасці станковага твора».

А яшчэ падаецца, што космас можна насіць у сабе. І неабавязкова быць філосафам па жыцці, бо драбніцы Сусвету раскіданыя па зямлі. У асобных сюжэтах і фрагментах, у людзях і іх душах, у памкненнях ісці далей і бачыць больш. І калі гэта ўсё ў нейкі момант перасягае асабістыя жаданні, то можна вострa адчуваць актуальныя праблемы сваёй эпохі. Кішчанка маштабны не толькі па памерах твораў, ён маштабны па глыбіні ўспрымання і па пластычнасці ўвасаблення творчых ідэй, калі рэчаіснасць і жывапісны рэалізм можа захапляць. А ці ўсё мы ведаем (бачылі) на зямлі?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**